**Гавяйновіч, В.** Дарога медаля / В. Гавяйновіч // Полацкі веснік. — 2012. — 14 лют. — С. 4.

# ДАРОГА МЕДАЛЯ



**Пэўна, у кожнага з нас ёсць такое месца на зямлі, куды заўсёды хочацца вярнуцца. Для Генадзя Арлова такой кропкай на карце стала веска Мацюшы. Справа ў тым, што ён тут нарадзіўся. Непадалёку вырастаў новы горад, і бацькі ў хуткім часе пераехалі ў Наваполацк. Але кожнае лета Генадзь праводзіў у Мацюшах, у сваёй бабулі Яніны Данатаўны Фядкевіч. Лес, чыстае паветра, родны бабулін дом... Усё гэта яму потым помнілася і ў далёкім Узбекістане, у Фергане, дзе стаяў іх полк, і ў Афганістане, у Кабуле, дзе прыйшлося пад штодзённымі абстрэламі рамантаваць самалёты.**

Пасля школы Генадзь Арлоў паступіў у Васількоўскае ваеннае авіяцыйна-тэхнічнае вучылішча, што пад Кіевам. Закончыў яго і быў накіраваны ў Фергану, у авіяцыйны ваенна-транспартны полк. Першую баявую ўзнагароду, медаль «За баявыя заслугі» Генадзь Уладзіміравіч атрымаў, калі пачалася афганская вайна. Самалёты даводзілася рамантаваць кругласутачна. А гарачыня... Метал награваўся так, што да яго нельга было дакрануцца. А яны рамантавалі, за дзень два-тры самалёты, пры норме адзін. Гэта была іх падтрымка савецкіх салдат, якая на вайне завецца ваенным брацтвам. Кожны баявы самалёт у небе быў надзеяй салдат.

Пра ваенныя афганскія падзеі падпалкоўнік у адстаўцы Генадзь Арлоў расказвае па-мужчынску скупа, без асаблівых падрабязнасцяў. У 1989 годзе, калі вайна ўжо закончылася, кіраўнік Рэспублікі Афганістан Наджыбула папрасіў Савецкі ўрад дапамагчы ў аднаўленні авіяцыйнай тэхнікі. У кабульскім аэрапорце, з 32 самалётаў у неба маглі падняцца толькі тры. У камандзіроўку ў Афганістан былі накіраваны чатыры спецыялісты, сярод якіх быў і Генадзь Арлоў. Кабул быў акружаны, літаральна штодзень абстрэльваўся. А на вайне як на вайне, куды ўпадзе чарговая ракета... Аднойчы трапіла ў савецкае пасольства. За паўгода з 29 самалётаў яны паставілі на крыло 23.

Дапамога савецкіх спецыялістаў была ацэнена. Генадзь Уладзіміравіч Арлоў быў узнагароджаны двума афганскімі медалямі «За адвагу» і «За баявыя заслугі».

Калі выканалі задачу, і Генадзь Арлоў вярнуўся ў свой полк, было накіравана прадстаўленне на ўзнагароду яго медалём «За баявыя заслугі». Праўда, атрымаў яго толькі…праз дваццаць гадоў.

Дарэчы будзе сказаць, што іх авіяцыйны атрад па просьбе ўрада Эфіопіі, калі там была засуха, дапамагаў вазіць харчаванне. Эвакуіраваў людзей. У Мазамбіку яны перавозілі грузы.

Час ішоў, Генадзь Арлоў служыў намеснікам начальніка інжынерна-авіяцыйнай службы палка, потым у штабе ПДВ у Ташкенце адказваў за матэрыяльнае забеспячэнне транспартнай авіяцыі Узбекістана. І працягваў вучыцца: у 2000 годзе за кончыў вячэрняе аддзяленне авіяцыйнага інстытута ў Ташкенце.

Тыл, як кажуць ваенныя, у яго быў заўсёды надзейны: дома чакала любячая сям'я – жонка Алена дарэчы, яна родам з вёскі Дзёрнавічы, сын Віктар і дачка Алеся.

У 2005 годзе ён дэмабілізаваўся. Закончылі вучобу дзеці, і яны вярнуліся ў Беларусь. Дачка выйшла замуж і жыве ў Германіі, сын – у Віцебску, а яны прыехалі ў Мацюшы. Пасля стэпаў і гарачага сонца хацелася жыць там, дзе больш зеляніны, прырода, цішыня. Арловы ўладкаваліся на працу ў ААТ "Мацюшы". Генадзь Уладзіміравіч – загадчыкам майстэрні, Алена Геннадзьеўна – бухгалтарам. Пра новую работу былы ваенны інжынер жартаваў у час нашай размовы: *"Вось кажуць, што паветраныя дэсантнікі – гэта крута, а я скажу, што сельскія працаўнікі – вось дзе крута, калі вясну, лета, восень сяльчане працуюць без выхадных і ўвесь светлавы дзень"*.

У верасні мінулага года Генадзя Арлова выклікалі ў пасольства Расіі і ўручылі медаль «За баявыя заслугі». Узнагарода ішла да яго цэлых дваццаць гадоў.

**В. Гаваяйновіч**